Сычова, І.С. Беларускія народныя загадкі як сродак інтэлектуальнага развіцця /І.С. Сычова // Роднае слова: штомесячны навуковы і метадычны часопіс. – №6. – 2022. – С. 76-78.

# Беларускія народныя загадкі як сродак інтэлектуальнага развіцця

*Сычова І.С.*

**Ключавыя словы:** беларускія народныя загадкі, загадкі-метафары, загадкі-пытанні, загадкі-задачы, беларуская народная педагогіка, разумовае выхаванне, інтэлектуальнае развіццё, формы работы з народнымі загадкамі.

Артыкул прысвечаны аналізу педагагічнага патэнцыялу беларускіх народных загадак, якія ў народнай педагогіцы з’яўляўцца традыцыйным сродкам (формай) выхавання, тэхналогіяй (метадам) праблемнага навучання, дыягнастычным паказчыкам развіцця асобы. Адначаецца, што народныя загадкі адлюстроўваюць светаўспрыманне і маральныя якасці беларусаў, адметнасць лексічнага і фанетычнага складу роднай мовы, рэаліі традыцыйнай культуры і побыту. Вызначаны педагагічныя асаблівасці беларускіх народных загадак і прапанаваны формы работы з імі ў вучэбнай і пазакласнай рабоце.

Беларускія народныя загадкі з’яўляюцца арыгінальным, але не ў поўнай меры вывучаным і адпаведна сваёй назве, загадкавым, жанрам фальклору сродкам народнай педагогікі. У сучасным разуменні “загадка – гэта іншасказальнае вобразнае апісанне якога-небудзь прадмета або з’явы на аснове падабенства паміж утоеным прадметам, які трэба адгадаць, і тым, які замяняе яго ў загадцы” [1, с.10]. Верагодна, слова ўтворана ад дзеяслова “гадаці” – думаць, разважаць.

Беларускія народныя загадкі збіралі як дарэвалюцыйныя, так і савецкія даследчыкі Д. Булгакоўскі, Л. Васілеўскі, П.А. Гільтэбрандт, А. Гурыновіч, В. Дыбоўскі, С.П. Мікуцкі, Е.А. Ляцкі, І.І. Насовіч, Н.Я. Нікіфароўскі, Ч. Пяткевіч, Е.Р. Раманаў, Я. Рапановіч, М. Рыбнікава, М. Федароўскі, Я. Чачот, П.П. Чубінскі, Р.Р. Шырма, П.В. Шэйн, І. Юркевіч, Э. Яленская; тэарэтычным вывучэннем займаліся П.П. Ахрыменка, Н.С. Гілевіч, М.Я.Грынблат, А.І. Гурскі, К.П. Кабашнікаў, Я.Ф. Карскі.

У беларускай народнай педагогіцы загадкі з’яўляюцца, па-першае, традыцыйным сродкам (формай) выхавання ў шырокім сэнсе (не толькі разумовага, але і маральнага, эстэтычнага, экалагічнага і інш.); па-другое,

праблемнай тэхналогіяй (праблемным метадам) навучання, наўмысна арыентаванай на развіцце тэарэтычнага мыслення і творчых здольнасцей; па-трэцяе, дыягнастычным паказчыкам інтэлектуальнага і агульнага развіцця асобы як у рэальным жыцці, так і ў ходзе народных святаў і абрадаў. Працэс загадвання і адгадвання народных загадак па сваёй сутнасці з'яўляецца інтэлектуальным спаборніцтвам (індывідуальным або калектыўным), развівае волю, настойлівасць, імкненне дабівацца поспеху не толькі сілай, а перш за ўсё розумам, кемлівасцю.

Народ высока ацэньваў патэнцыял дадзенага малога жанру фальклору як сродку разумовага выхавання: *"Сіта, віта, круглавіта, хто адгадае, вялікі розум мае"* (Павуцінне) [1, с. 149]. З дапамогай загадак ацэньваўся ўзровень інтэлектуальнага развіцця і вызначалася магчымасць змены сацыяльнага статусу: *"Сонца-калонца, пасярэдзіне жывіца, хто не адгадае, не будзе жаніцца"* (Вочы) [1, с. 104], *"Удзень, як абруч, уночы, як вуж, хто гэту загадку адгадае, то будзе мой муж"* (Пояс, папружка) [1, с. 252]. Па зместу народных загадак можна меркаваць, што яны мелі дыферэнцыяцыю па ўзросту і выкарыстоўваліся ў залежнасці ад сацыяльнага кантэксту: на радзінах і хрысцінах, на вяселлі, на вячорках зімой, на пахаванні і інш. Як выяўлена даследчыкамі, загадкі загадваліся пераважна ў доўгія зімовыя вечары, на традыцыйных вячорках у перадкалядны і калядны перыяд.

Разумовае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы накіравана на развіццё мыслення, удасканаленне прыродных інтэлектуальных дадзеных і здольнасцей дзіцяці, фарміраванне прывычкі да інтэлектуальных заняткаў і практычнае далучэнне да іх сродкімі традыцыйнай культуры. Пры гэтым аснову інтэлектуальнага развіцця, згодна ўстойлівых народных уяўленняў, складаюць прыродныя дадзеныя.

Разгадванне займальных і вясёлых народных загадак з дзяцінства фарміравала цікавасць да інтэлектуальнай дзейнасці: *"Сем семярэй, семера свіней, свінка, свінчын брат і семера парасят"* (Усяго 65) [1, с. 316].

Для выяўлення і развіцця матэматычных здольнасцей, дыягностыкі ўзроўню інтэлекту прызначаны мудрагелістыя народныя задачы-загадкі: *“Ляцела сто гусей, аж ідзе чалавек дай кажа: – Здаровы, сто гусей! – Здароў, чалавеча, – кажуць, – калі б нас яшчэ столькі, да яшчэ палавінка етаго, да яшчэ чвертка етаго і ты з намі, дак тагды б было нас сто” (Трыццаць шэсць гусей)* [2, с. 277].

Паводле этнаграфічных дадзеных, падобныя загадкі-задачы непісьменнымі селянінамі паспяхова рашаліся з дапамогай рысак і гарохавін (варыянты – бабоў, фасолін): *“Ішло сем баб, у кожнае бабы па сем кіёў, на кожном кію па сем сукоў, на кожном суку па сем кашалёў, у кожном кашалю па сем кошак, у кожнае кошкі па семера кацянят. Сколькі ўсяго будзе?”* [2, с. 276-278]. Такім чынам, беларускія народныя загадкі можна разглядаць, па-першае, як сродак разумовага выхавання; па-другое, як дыягнастычны паказчык дасягнутага ўзроўню інтэлектуальнага развіцця асобы.

Паказальна, што ў народных загадках разглядаюцца не толькі канкрэтныя, але і абстрактныя паняцці: *“Крылляў не маю, а хутка лятаю, сам мяне выпусціш, ды потым не зловіш”* (Слова) [1, с. 287], *“Без чаго чалавек не можа жыць?”* (Без імені) [1, с. 309], *“Хто ідзе без ног?”* (Поры года) [1, с. 306], *“Што быстрэй усяго на свеце?”* (Думка) [1, с. 308], *“Што на сабе не ўчуеш?”* (Рост) [1, с. 308]. Дадзеныя творы знаёмяць дзіця з агульнапрынятымі ўяўленнямі беларусаў аб чалавеку, аб роднай зямлі, аб сэнсе жыцця.

Беларускія народныя загадкі ў сваім змесце захоўваюць народную мудрасць і маюць значны маральна-выхаваўчы патэнцыял: *“Жыве без цела, гаворыць без языка, ніхто яго не бачыць, а кожны чуе”* (Сумленне) [1, с. 273], *“Як гукнецца – так і адзавецца”* (Рэха) [1, с. 49].

У беларускай народнай казцы “Разумная дачка” расказваецца пра справядлівы суд з выкарыстаннем народных загадак, якія ў дадзеным выпадку выступаюць як сродак дыягностыкі не толькі разумовых здольнасцей герояў, але і праверкі іх далучанасці да традыцыйнай сістэмы ведаў аб матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцях. Бядняк з дапамогай разумнай дачкі-

сямігодкі адгадвае загадкі: *“...няма нічога сыцей за зямлю, бо яна ўсіх корміць; няма нічога саладзей за сон, бо хоць якое гора, а засьнеш дык і забудзешся; і няма нічога шпарчэй за людзкія думкі, бо сам ты яшчэ тут, а думкі ўжо далёка-далёка...”* [3].

Падобна прыказкам і прымаўкам, загадкі ўтрымліваюць часцінку народнай філасофіі, але ў адрозненні ад іх не павучаюць, а абуджаюць здольнасць да развужанняў: *“Што любіш – не купіш, што не любіш – не прадасі”* (Маладосць і старасць) [1, с. 94]; *“Душа кажа: “Згуба мая”. Цела кажа: “Радасць мая”* (Гарэлка) [1, с. 196].

Народныя загадкі прымушаюць задумвацца аб сутнасці жыцця і смерці: *“Прыйшоў нехта, узяў нешта, ганіся за тым, хто ведае за кім”* (Смерць) [1, с. 279], *“Я не быў там, што цяпер ты, а ты будзеш там, дзе цяпер я”* (Дзіця мертванароджанае) [1, с. 280], *“Кожнаму трэба, а сам сабе не зробіш”* (Труна) [1, с. 280],*“Харомы нізкія, суседзі блізкія, разам жывуць, адзін к аднаму не ходзяць” (Могілкі)* [1, с. 282].

Беларускія народныя загадкі – невычэрпная і займальная крыніца ведаў пра традыцыйную сям’ю, сваяцтва, сямейнае выхаванне. Гэта і загадкі-задачы, загадкі-пытанні для дзяцей і людзей розных узростаў: *“Два браты, а адзін з іх мой дзядзька. Хто другі?”* (Бацька) [1, с. 275], *Сядзіць дзіця на гародзе, сядзіць і гаворыць: “У мяне ёсць бацька, маці, а я ім не сын”* (Дачка) [1, с. 275], *“Дзве дачкі, дзве мацеры і бабулька з унучкай. Колькі ўсіх?”* (Трое: бабка, маці, дачка) [1, с. 314], *“Ішоў брат з сястрою і муж з жаною, найшлі тры сыры. Як яны падзялілі?”* (Па аднаму сыру) [1, с. 315].

І разважанні дарослых аб змене пакаленняў, і своеасаблівая сямейная эканоміка: *“Пяць разоў гарэў, адзін раз строіўся”* (Пяць дачок замуж аддаваў і аднаго сына жаніў) [1, с. 276]; і народны гумар: *“Ішоў чалавек дарогай, ажно ўдваіх сена грабуць: – Калі брат з сястрою – памажы, божа, а мужык з жаною – смешкі да жарты. – А не брат з сястрою, не мужык з жаною, мая матка яе матцы свякроўкай была”* (Бацька з дачкою) [1, с. 275].

У загадках раскрываюцца гуманістычныя адносіны да дзяцей у традыцыйнай беларуская сям'і: *"Што даражэй золата, серабра?"* (Дзіця) [1, с. 276], *"Што за звярок: па хаце ходзе, ніхто яму не шкодзе, усякі яго ўважае, дарогу саступае"* (Дзіця) [1, с. 276].

Паказаны асаблівасці догляду нованароджаных: *"Прыехаў госць без вясцей, еў мяса без касцей*" (Малое дзіця і грудзі маці) [1, с. 277], *"Жывы жывога есць і ў вочы глядзіць"* (Маці корміць дзіця) [1, с. 277], *"Сярод хаты вісіць дзед гарбаты*" (Калыска) [1, с. 226],*"Чатыры чатыркі, пятая растапырка, шостая жывушка"* (Калыска і дзіця) [1, с. 227].

Гістарычным сведчаннем можна лічыць лаканічнае апавяданне пра даўнія часы, калі маці вымушаны былі браць немаўлят на поле ў час жніва, дзе іх жыццю пагражалі драпежнікі: *"На гары, на даліне, увесь люд пабіты, прыбег пацімкін, узяў кугакала. Садзіся на аўсянічка, бяры пасейнічка, быры ў рукі страхоту, даганяй пацімкіна, адбірай кугакала"* (Ніва, воўк, дзіця, конь, сабака, ружжо) [1, с. 157].

Адлюстраваны дзіцячы побыт, традыцыйныя дзіцячыя забавы*: "На гарбатых братах дзеці цешацца"* (Сані) [1, с. 264], *"Чатыры сястрыцы пайшлі ў брусніцы"* (Каламажка) [1, с. 257], *"Тры братцы пайшлі на раку купацца, два купаюцца, а трэці на беразе валяецца"* (Вёдра і каромысел) [1, с. 236], *"Малыя дзеці сядзяць на павеці, а як падрастаюць, на зямлю злятаюць"* (Арэхі) [1, с. 62].

Ухваляецца вялікая сям'я: *"У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна"* (Вулей) [1, с. 120], *"У маці дваццаць дзетак. Усе дзеткі-аднaлеткі"* (Курыца з куранятамі) [1, с. 125], *"У чатырох мацярэй па пяць сыноў, адно імя ўсім"* (Пальцы) [1, с. 105], *"Ні вокан , ні дзьвярэй – поўна горніца дзяцей"* (Агурок) [1, с. 82], *"Сям'я – душ трыста, а хата – усяго два локці"* (Гарбуз) [1, с. 85].

Паказаны складаныя сямейныя ўзаемаадносіны *"Што гэта за маці, што дзяцей сваіх не бачыць"* (Зязюля ) [1, с. 141], *"Адна матка дванаццаць сыноў мае і ўсё на іх націскае"* (Граблі) [1, с. 166], *"Два браты ў ваду глядзяцца, а разам не сыходзяцца"* (Берагі) [1, с. 33], *"Сястра да брата ў госці*

*едзе, а брат ад яе хаваецца”* (Дзень і ноч) [1, с. 56],*“Свёкар свякрыві дзёр скуру да крыві”* (Бурак) [1, с. 193], *“Як быў ратай, то ўвесь наш род ратаваў, як прыйшлося ўміраць – некаму касцей пахаваць”* (Гаршчок) [1, с. 233].

Загадкі пра чалавека спалучаюць народную мудрасць і практычныя веды: *“Зранку ходзіць на чатырох нагах, удзень – на дзвюх, а ўвечары – на трох”* (Чалавек у розным узросце) [1, с. 93], *“Сорак нядзель у турме сядзеў, два гады вісеў, а такі жыў выйшаў”* (Чалавек) [1, с. 93].

Народныя загадкі захоўваюць даўнія формы беларускіх асабовых імёнаў: *“Ёсць у маткі дзьве дочкі Мар’і і сын Гапон”* (Хата лаўкі палок для спання) [1, с. 224], *“Сухі Мартын (Стахій, Васілька, Данілка, Антон) па хаце скача”* (Венік) [1, с. 237], *“Маленькі Сідорка кусае і выкідае”* (Свярдзёлак) [1, с. 249], *“Восем братоў Кандратоў, два браценнікі Амілляны ды дзве сястры Улляны”*(Сані) [1, с. 264], *“Кася на ўвесь свет расцяглася”* (Дарога) [1, с. 269]. Загадкі сведчаць, што імені, назве надавалася значная ўвага: *“Ёсць на свеце адно і для ўсіх яно нужно” (*Імя) [1, с. 279], *“Сем братоў, гадамі роўныя, а імёны іх розныя”* (Дні тыдня) [1, с. 53].

Загадкі пра часткі цела чалавека вылучаюцца трапнымі параўнаннямі і жыццёвыя назіраннямі: *“Два браты цераз мяжу жывуць, адзін другога не бачаць”* (Вочы) [1, с. 101], *“За сцяною касцяною салавейка шчабеча”* (Язык) [1, с. 96], *“Повен хлявец белых авец”* (Зубы) [1, с. 99],*“Касцяшка сячэ, дзеравяшка вязе, а мокры Мартын падкладвае*” (Зубы, лыжка, язык) [1, с. 101], *“Адзін гаворыць, двое глядзяць, двое слухаюць”* (Язык, вочы, вушы) [1, с. 101], *“Без агню, а варыць”* (Страўнік) [1, с. 105], *“Як у вас, так у нас – поўна дзежачка каўбас”* (Кішкі, жывот) [1, с. 105].

У традыцыйных загадках асобныя часткі чалавечага цела надзяляюцца маральнымі якасці: *“Гаршчок разумны, хоць сем дзірак мае”* (Галава) [1, с. 95], *“На стале не бывае, а ўвесь свет пітае”* (Грудзі маці) [1, с. 107], *“Маленькі работнік шмат гадоў працаваў, ніколі не спаў, толькі адзін раз працаваць перастаў – і навек прапаў”* (Сэрца) [1, с. 105].

У народных загадках раскрываюцца асноўныя віды працоўнай дзейнасці беларусаў, адпаведныя ім дзеянні і прылады працы: жывёлагадоўля і земляробства, народныя рамёствы і промыслы.

Земляробства: "*Крывенькі дзядок усё поле аббегаў"* (Серп) [1, с. 167], *"Тысяча братоў адным поясам падпаясаны"* (Сноп) [1, с. 158], *"Матка гладка, а дзеці кручоныя"* (Ток і цэп) [1, с. 158], *"Матка гладка, сыны-цыкуны, дочкі-палізухі"* (Гумно) [1, с. 158], *"Два браты-пракураты па падзямеллю ходзяць"* (Лемяшы) [1, с. 162], *"Ішло братоў дваццаць пяць, пасля зімы сляды знаць"* (Барана) [1, с. 162], *"Бацька з сажань, маці з аршын, дзеці па каршочку*" (Граблі) [1, с. 166];

Народныя рамёствы: *"Пайду ў лес, высеку сук, з лясінкі зраблю і дзяжу, і века, і двое начовак"* (Арэх) [1, с. 62],*"У мацеры дзесяць сыноў; пяць у дарозе, а пяць дома"* (Пальцы у час прадзення) [1, с. 179], *"Маленька бабушка ўвесь свет адзявае"* (Іголка) [1, с. 182], *"Брат брата сячэ – бела кроў цячэ"* (Жорны і мука) [1, с. 184], *"Адзін дзед ніколі не наесца"* (Млын) [1, с. 187], *"Матка гладка, бацька лысенькі, дзеткі вышчаркі"* (Ступа, таўкач, зерне канапель) [1, с. 189].

Хата, хатнія (пераважна жаночыя) заняткі, хатняе начынне: *"Цераз пляцень, цераз хату, неслі бабу чаравату"* (Скрыня) [1, с. 227], *"Сама тоўстая, рубашка кароткая"* (Дзяжа) [1, с. 191], *"Чатыры заловачкі схілілі галовачкі пад адным капелюшом"* (Стол) [1, с. 223], *"Стара баба цэлую зіму дзяцей агравае"* (Печ) [1, с. 204], *"Маці таўстуха, дачка краснуха, а сын перабор выскачыў на двор"* (Печ, агонь, дым) [1, с. 205], *"Рабінава нявестка па калені ў золаце стаіць"* (Гаршчок у агні) [1, с. 232], *"Два браты адзін на аднаго глядзяць, а разам не сыйдуцца"* (Падлога і столь) [1, с. 200], *"Чатыры сястрыцы пайшлі ў чарніцы – ніколі дамоў не вернуцца"* (Бэлькі ў хаце) [1, с. 203].

Працавітасці як важнейшай чалавечай якасці і традыцыйным працоўным заняткам знаходзяцца аналогіі ў свеце прыроды: *"Працуе цэлы век, а не чалавек"* (Чарвяк) [1, с. 145],*"Семсот муляроў збудавалі дом без вуглоў"*

(Мурашкі) [1, с. 153], *“Сто сястрыц адну хустку вяжуць”* (Пчолы і соты) [1, с. 120], *“Без станка і без рук, а кросны тчэ”* (Павук) [1, с. 149].

Загадкі экалагічнай тэматыкі ўтрымліваюць батанічныя, заалагічныя, арніталагічныя, геаграфічныя, метэаралагічныя веды, якія лепш запаміналіся ў вобразнай вершаванай форме: *“Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае”* (Раса) [1, с. 41].

Родная прырода – выток народнай мудрасці, значных абагульненняў: *“Мяне б’юць, калоцяць, варочаюць, рэжуць, а я ўсё цярплю і ўсім дабром плачу”* (Зямля) [1, с. 29], *“Кроў маю п’юць, косці мае паляць, маімі рукамі адзін другога б’юць”* (Бяроза) [1, с. 58].

Прыгажосць і прырода ў загадках непарыўна звязаны: *“З акна ў акно – залатое верацяно”* (Прамень сонца) [1, с. 25], “*За лесаму сіні агонь гарыць*” (Лён) [1, с. 71],*“Сівенькі жарабец па ўсяму свету ржэць”* (Гром) [1, с. 36].

Загадкі адлюстроўваюць адзінства прыроднага і сацыяльнага жыцця на аснове гуманістычнага падыходу:*“І сваё дзіця не забыла, і чужых малачком напаіла”* (Карова) [1, с. 109]; каляндарныя і сямейна-бытавыя абрады: *“Прасіў цар царыцу да сябе на вячоркі, а яна кажа: “На неба не гляджу, па зямлі не хаджу, да цябе не пайду”* (Рак і рыба) [1, с. 143], *“Два арлы арлуюць, чужое яечка балуюць”* (Кум, кума і дзіця) [1, с. 279].

У народных загадках аб роднай прыродзе, вобразах і сугучнасці гукаў адлюстравана традыцыйная для беларусаў гукавая карціна свету: *“Рыкнуў вол за многа гор, за многа вод, за многа сёл”* (Гром) [1, с. 35],*“У полі салавей свішча”* (Вецер) [1, с. 39], *“Каля вуха завіруха, а на вуліцы – кірмаш”* (Вулей) [1, с. 159], *“За сцяною касцяною цецерук балбоча”* (Язык) [1, с. 96].

Яе ўзбагачаюць і дапаўняюць загадкі пра народныя музычныя інструменты: *“У лесе сцята, на рукі ўзята, плача, а не дзіця”* (Скрыпка) [1, с. 290], *“Раве, як цялёнак, плача, як рабёнак; ні мяса, ні кішок, толькі адзін трыбушок”* (Дуда) [1, с. 292], *“Як быў мал, у чатыры дудкі граў, як узрос, гору і даліну знёс, а па смерці танцы выдаў”* (Вол) [1, с. 110].

Шырока прадстаўлена этнічнаадпаведная каляровая карціна свету: *“Чорная карова ўвесь свет збарола, бела ўстала – увесь свет пападымала”* (Ноч, дзень) [1, с. 55*], “Шэрае сукно лезе ў акно”* (Світаннне) [1, с. 53], “*Сіняя дзяружка ўвесь свет накрыла”* (Неба) [1, с. 21],*“Чырвонае карамысла праз рэчку павісла”* (Вяселка) [1, с. 41], *“Сярод лесу агонь гарыць”* (Каліна) [1, с. 64], *“За лесам сіні агонь гарыць”* (Лён) [1, с. 71].

*“Што сіне не сінячы?”* (Неба) [1, с. 306], *“Што бела не белячы?”* (Лебедзь, снег) [1, с. 307],*“Што чорна не чэрнячы?”* (Воран) [1, с. 307], – у культуры кожнага народа на гэтыя пытанні даюцца свае ўніверсальныя і разам з тым адметныя адказы.

Народам створаны арыгінальныя асацыятыўныя вобразы: *“Дзве сястрыцы сцюдзёным малачком мыюцца”* (Палазы) [1, с. 264], *“Матчыну скрыню не паднімеш, дочкіную трубку не скатаеш, братнінага коніка не паймаеш”* (Зямля, дарога, вецер) [1, с. 29], *“У ліпавым кусце завіруха (мяцеліца) мяце”* (Муку сеюць) [1, с. 190], *“Ляцела пава, на белым камені пала, камень разбіла – усіх мёртвых узбудзіла”* (Квактуха) [1, с. 12].

Адгадваючы загадку дзіця можа ўявіць (пачуць, убачыць, адчуць водар, смак) як успрымаўся навакольны свет нашымі продкамі, што спрыяе і эстэтычнаму, і патрыятычнаму выхаванню.

Педагагічныя асаблівасці беларускіх народных загадак:

1. З’яўляюцца комплексным сродкам выхавання і праблемнага навучання, удасканалення і дыягностыкі інтэлектуальнага і творчага развіцця асобы.
2. Перадаюць з пакалення ў пакаленне этнічную карціну свету, з’яўляюцца даступным для дзіцячага ўспрыняцця банкам вобразаў і асацыяцый, створаным беларускім народам ў межах традыцыйнага ладу жыцця на ўлонні роднай прыроды.
3. Узбагачаюць розум дзіцяці сістэмай традыцыйных тэарэтычных і практычна-карысных ведаў, назіранняў, поглядаў, уяўленні беларусаў (аб прыродных стыхіях, раслінным і жывёльным свеце, народным

календары, працоўнай дзейнасці і арганізацаі побыту, сямейным і грамадскім жыцці, рэаліях культуры і інш.).

4. Выпрабоўваюць кемлівасць, хуткасць і вастрыню думкі, правяраюць маральную і разумовую сталасць індывіда, далучанасць да традыцыйнага ладу жыцця, прыналежнасць да пэўнага этнасу.

5. Садзейнічаюць развіццю маўлення, узбагачаюць слоўнікавы запас, вучаць адчуваць лексічныя, фанетычныя, граматычныя адметнасці роднай мовы, успрымаць падтэкст, народны гумар, рыхтуюць дзіця да ўспрыняцця буйных жанраў фальклору і сродкаў вобразнасці (эпітэт, параўнанне, метафара, алегорыя, алегарычнае параўнанне, увасабленне, гіпербала, іронія, паўтар, рытм, рыфма), адначасова абуджаючы імкненне да ўласнай моўнай і паэтычнай творчасці.

6. Развіваюць, удасканальваюць разумовую дзейнасць, садзейнічаюць авалодванню асноўнымі разумовымі аперацыямі (вучаць аналізаваць, раскладаць цэлае на часткі і збіраць цэлае з частак (аналіз і сінтэз), абстрагавацца ад дэталей, класіфікаваць, параўноўваць, супастаўляць, абагульняць, сістэматызаваць прадметы і з’явы, даваць іх усебаковую характарыстыку).

7. Утрымліваючы праблемныя пытанні і задачы, загадкі актывізуюць інтэлектуальныя і творчыя магчымасці, фарміруюць крытычнае мысленне, разбураюць стэрэатыпы, дазваляюць паглядзець на прыроду, чалавечае жыццё, працоўныя дзеянні, знаёмыя побытавыя рэчы ў новым ракурсе, знаходзіць падобнае ў непадобным.

8. Прывучаюць думаць і выказваць думкі лаканічна, лагічна і адначасова вобразна, актывізуюць развіццё розных відаў мыслення ў іх непарыўным спалучэнні: ад наглядна-дзейснага і наглядна-вобразнага да славесна-лагічнага.

9. Развіваюць і трэніруюць памяць, назіральнасць, здольнасць заўважаць характэрныя дэталі як асобнага індывіда, так і ў цэлым садзейнічаюць выпрацоўцы мнеманічных прыёмаў на аснове стварэння асацыятыўных

сувязей паміж далёкімі на першы погляд прадметамі і з'явамі з мэтай эфектыўнай перадачы традыцыйная культура ў вуснай форме.

Такім чынам, беларускія народныя загадкі – комплексны сродак народнай педагогікі, які адлюстроўвае адзінства экалагічнага, працоўнага, маральнага, разумовага выхавання і дазваляе лаканічнымі сродкамі данесці да дзяцей рознага ўзросту асноўныя выхаваўчыя ідэі.

Формы работы педагога з беларускімі народнымі загадкамі:

- адгадванне загадак (індывідуальнае або групавое);
- спаборніцтвы (віктарыны, конкурсы, батлы) знаўцаў народных загадак;
- гутаркі па зместу загадак, тлумачэнне слоў, супастаўленне рэалій традыцыйнай культуры і сучасных (жыллё, працоўныя заняткі, сям'я і інш.);
- тэматычны падбор загадак аб прадмеце ці з'яве: "бортніцтва, пчалярства як традыцыйны занятак", "народныя музычныя інструменты", "чалавек і яго цела", "харчаванне і яда" і інш.;
- аднаўленне, "збіранне" загадак (з прапушчанымі літарамі, словамі, пераблытанымі часткамі);
- рэдагаванне загадак (замена слоў, або частак на іншыя);
- складанне ўласных загадак па пэўнаму ўзору або тэме;
- малюнкі да загадак «Адгадай загадку і намалюй адгадку»;
- інсцэнаванне, тэматычны (дзікія і свойскія жывёлы, насякомыя і інш.) або адвольны паказ загадак (адгадак) з дапамогай мімікі і жэстаў («Кракадзіл»);
- вусны або пісьмовы пераклад, параўнанне народных загадак на беларускай і замежнай мовах, выяленне агульнага і адметнага (у змесце, форме, тэмах і інш.);
- навукова-даследчыя заданні, праекты: запіс (падбор у друкаваных крыніцах) народных загадак пэўнай мясцовасці (тэматыкі), складанне інтэрактыўнага атласу (карты) рэгіянальных загадак і адгадак, выяўленне загадак і аналіз іх ролі ў іншых жанрах народнай творчасці

(казках, песнях, абрадах), складанне і выданне слоўніка загадак і адгадак, параўнальны аналіз загадак розных народаў і інш.

Напрыклад, для творчага задання “Адгадай загадку і намалюй адгадку” можна прапанаваць паэтычныя народныя загадкі, якія выклікаюць шмат асацыяцый: “*Дуб-дубавік, 12 галінак, на кожнай галіне па 4 гняздзіны, у кожнай гняздзіне па 7 птушанят, кожнае мае сваё імя. Хто адгадае, што за сям’я?” (Год, месяц, тыдзень, дзень), “У чубатых дочак па сямсот сарочак, па сямсот спаднічак, а без чаравічак”* (Куры), *“Ва ўсіх дзетак адзенне з манетак”* (Рыба), *“Вісіць сіта не рукамі звіта”* (Павуцінне) і інш. ) [4].

У залежнасці ад выкладаемага вучэбнага прадмета мэтазгодна выкарыстоўваць загадкі па наступных тэмах: геаграфія – прыродныя стыхіі, поры года; біялогія – чалавек і часткі яго цела, раслінны і жывёльны свет; фізіка – транспарт; матэматыка – загадкі-задачы; працоўнае навучанне – рамествы, харчаванне і ежа; гісторыя – адзенне і абутак, рэлігія; грамадазнаўства – сямейныя і грамадскія адносіны; музыка і спевы – святы і абрады, музычныя інструменты; беларуская мова і літаратура: знайсці і растлумачыць састарэлыя словы, падабраць дзеясловы дзеяння і руху, канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі, вызначыць параўнанні, алегорыі, гіпербалы, метафары, вызначыць рытм, рыфму і г.д., руская мова: перакласці, падабраць адпаведныя загадкі ў фальклоры рускага народа і інш.

Пазакласныя мерапрыемствы з выкарыстаннем беларускіх народных загадак могуць быць праведзены ў любы час, але паводле народных уяўленняў найбольш мэтазгодна – зімой: у форме традыцыйных калядных вячорак, творчых конкурсаў (музычных, паэтычных, па асацыятыўнаму маляванню), інтэлектуальных спаборніцтваў з выкарыстаннем праблемных пытанняў і загадак-задач, конкурсаў знаўцаў беларускіх народных загадак або тэматычных загадак на мовах розных народаў, гульня-падарожжа для малодшых школьнікаў “У гасцях у народнай загадкі” і інш. Вельмі арганічнымі будуць беларускія народныя загадкі ў змесце экскурсіі або непасрэдна ў экспазіцыі школьнага этнаграфічнага музей, дзе дзеці змогуць на

свае вочы убачыць адгадкі – рэчы, інструменты, прылады працы, якія на сённяшні дзень выйшлі з ужытку.

У залежнасці ад асаблівасцей псіхафізічнага развіцця вучняў можна зрабіць акцэнт на перадачы ў беларускіх народных загадках калераў і адпаведных вобразаў і асацыяцый, або, наадварот гукаў і адпаведных гукавых вобразваў і асацыяцый. Напрыклад, запытацца ў дзяцей:

– Як бачылі навакольны свет нашы продкі? *(“Разаслана посцілка, на посцілцы рассыпаны сярэбраны пясочак, а пасярэдзіне залаты кружочак”, (Неба, зоркі, месяц), ”На паляне сіняй пасецца конь сівы” (Месяц на небе), “Повен падпечак чырвоных яечак” (Жар, вуголле))* [4]*;*

– Як чулі свет прыроды нашы продкі? *(“Сівы жарабец на ўсё царства заржаў” (Гром), “Пад зямлёю пеўнік пяе” (Плуг). “Не бразгае дзвярыма, у вокны не грукоча, а ў хату зойдзе, калі захоча” (Святло))* [4]*;*

– Як гучаць народныя музычныя інструменты? *(“Што плача і жалю няма?” (Скрыпка), “У ліпавым кусце мядзведзь равець” (Цымбалы), “У лесе выразана, гладка вычасана, ажно заліваецца, як называецца?” (Дудка), “Сам пусты, голас густы, дроб выбівае, людзей сабірае” (Бубен)* [4].

Нягледзячы на пэўную архаічнасць, беларускія народныя загадкі не страчваюць сваёй актуальнасці, застаюцца прыцягальнымі для прадстаўнікоў усіх узростаў. Гэта не проста мудрагелістыя разумовыя практыкаванні, а глыбокія па зместу і невычарпальныя па вобразнасці творы, у якіх зашыфравана продкамі і паступова раскрываецца для кожнага зацікаўленага сутнасць народнага светапогляду.

**Літаратура**

1. Загадкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад.: М.Я.Грынблат, А.І.Гурскі; рэд. тома А.С. Фядосік. - 2-е выд., выпр. и дапрац. Мн. : Беларус. навука, 2004 – 363 с. – (Беларуская народная творчасць).

2. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Часлаў Пяткевіч; уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л.Салавей і У.Васілевіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.

3. Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. Беларускія народныя казкі. Разумная дачка. – Дата доступу: 4.05.2020. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Bielaruskija_narodnyja_kazki/Razumnaja_dacka.html

4. Беларускія загадкі /складальнік Янка Саламевіч; мастак Рыта Цімохава. – Мінск: Юнацтва, 1989. – 63с.